УДК 808.26–311.11–808.26–311.5

***Н.Р. Якубук***

# АЙКОНІМЫ БРЭСТЧЫНЫ, МАТЫВАВАНЫЯ ФЛАРЫСТЫЧНЫМІ НАЗВАМІ

У артыкуле праводзіцца структурна-семантычны аналіз айконімаў Брэсцкай вобласці, суадносных з фларыстычнымі назвамі.

Айконімы, матываваныя фларыстычнымі назвамі, складаюць значны пласт лексічных адзінак у агульнай айканімічнай сістэме Брэсцкай вобласці, што ўяўляе сабой арганізаваную сістэму, часткі якой знаходзяцца ва ўзаемнай сувязі і абумоўленасці.

Уласныя назвы ўзнікаюць на розных этапах развіцця грамадства і нясуць у сабе адбітак сваёй эпохі. Лексічны матэрыял для геаграфічных найменняў чалавек браў не-выпадкова, а падбіраў з улікам пэўных заканамернасцей. Адным з адметных вынікаў гэтага складанага і працяглага гістарычнага працэсу з’яўляецца вылучэнне разнастай-ных лексіка-семантычных груп утваральных асноў айканіміі Беларусі.

Наяўнасць спрадвеку на беларускай зямлі мноства лясоў, бароў і гаёў давала падставы нашым продкам вызначыць пераважную пароду дрэў, хмызнякоў і травяністых раслін, якая часта з’яўлялася адметнай асаблівасцю той ці іншай мясцовасці, мела немалаважнае значэнне ў штодзённым побыце, гаспадарчай дзейнасці, і пакласці яе ў аснову назвы свайго паселішча.

Аналіз утваральных асноў айконімаў Брэстчыны, суадносных з назвамі расліннага свету, тых лексічных рэсурсаў, якія паслужылі базай для фарміравання назваў паселішчаў, дазваляе вылучыць тры лексіка-семантычныя групы:

1) айконімы, суадносныя з агульнымі назвамі раслін (Ягадная, Травы);

2) айконімы, суадносныя з канкрэтнымі відамі раслін (Сосны, Дубы);

3) айконімы, суадносныя з найменнямі лясных, садовых масіваў, зараснікаў, хмызнякоў (Бор, Лес, Садовы).

Група айконімаў, суадносных з агульнымі назвамі раслін, нешматлікая і прадстаўлена наступнымі назвамі: КУСТОВІЧЫ – Кобрынскі р-н, КУСТЫН – Брэсцкі р-н, КУСЦІЧЫ – Камянецкі р-н, ТРАВЫ – Кобрынскі р-н, ФРУКТОВЫ – Кобрынскі р-н, ЯГАДНАЯ – Баранавіцкі р-н.

Відаць, да гэтай жа групы можна аднесці і айконімы, якія ў сваёй аснове маюць лексему мох: АМШЫН – Лунінецкі р-н . ЗАМОШАНЫ – Жабінкаўскі р-н, ЗАМОШША – Маларыцкі, Лунінецкі, Баранавіцкі, Іванаўскі, Пружанскі р-ны, ЗАМШАНЫ – Маларыцкі р-н, ПАДОМША – Камянецкі р-н.

Назвы населеных пунктаў нашай вобласці, у якіх увасоблены канкрэтныя батанічныя найменні, вызначаюцца прыкметнай шматварыянтнасцю і паўтаральнасцю. Разам з тым семантычную матывацыю ўтваральных лексем часта адназначна ўстанавіць даволі складана, паколькі яны могуць абазначаць некалькі рэалій, а таксама з’яўляюцца мнагазначнымі словамі ў літаратурнай і дыялектнай мовах. Айконімы, суадносныя з канкрэтнымі відавымі найменнямі раслін можна падзяліць на наступныя групы:

– айконімы, суадносныя з канкрэтнымі найменнямі дрэў;
– айконімы, суадносныя з найменнямі кустарнікаў;
– айконімы, суадносныя з найменнямі травяністых раслін.

На Брэстчыне даволі пашыраны айконімы, суадносныя з канкрэтнымі найменнямі дрэў. Найбольшая колькасць такога тыпу назваў утворана ад лексем дуб, бяроза, ліпа, груша, сасна.

Так назвы Асавая /Мал., Стол./, Асавец /Лях./, Асавецкія /Бяроз./, Асаўніца /Іван./, Асаўцы /Стол./, Асніца /Пін./, Воса /Кобр./, Завосце /Бр./, Падоссе /Бяроз./ у аснове маюць “невядомы зараз назоўнік аса, які з’яўляецца назвай дрэва…, можна рэканструяваць на падставе наяўнасці прыметніка асовы (асовы лес, асовы грыб ці асавік) у значэнні “асінавы”. Айконімы і мікратапонімы маглі ўзнікнуць як на аснове назоўніка аса, так і прыметніка асовы”/1, с.7/. Як відаць з прыкладаў, уласныя геаграфічныя назвы, суадносныя з лексемай аса, сустракаюцца практычна на ўсёй тэрыторыі Брэстчыны.

Значнай колькасцю прадстаўлены айконімы, матываваныя лексемай дуб, што тлумачыцца ландшафтным значэннем гэтай драўлянай пароды, якая часта складае прыкметную асаблівасць мясцовасці, адыгрывае вялікую ролю ў гаспадарцы:

ДУБАВА – Баранавіцкі р-н, ДУБАВАЯ – Драгічынскі р-н, ДУБАВОЕ – Кобрынскі, Камянецкі, Лунінецкі, Драгічынскі р-ны, ДУБАЙ – Пінскі, Столінскі р-ны, ДУБАЎКА – Лунінецкі р-н, ДУБЕНЕЦ – Столінскі р-н, ДУБІНА – Лунінецкі, Ляхавіцкі р-ны, ДУБІНЫ – Кобрынскі р-н, ДУБІЦА – Брэсцкі р-н, ДУБІЧНА – Маларыцкі р-н, ДУБІШЧА – Баранавіцкі р-н, ДУБНАВІЧЫ – Пінскі р-н, ДУБНЯКІ – Ганцавіцкі р-н, ДУБОК – Брэсцкі р-н, ДУБЫ – Бярозаўскі р-н, ДУБЯНСКАЯ – Лунінецкі р-н, ЗАДУБ’Е – Ганцавіцкі р-н, ПАДДУБНА – Пружанскі р-н, СТАРАДУБЦЫ – Кобрынскі р-н, ТОЎСТЫ

ДУБ – Лунінецкі р-н.

Шырока прадстаўлены на Брэстчыне і найменні, што ў аснове маюць назоўнік бяроза:

БЕРАЗЛЯНЫ – Іванаўскі р-н, БЯРОЗА – Бярозаўскі р-н, БЯРОЗА КАРТУЗСКАЯ – Бярозаўскі р-н, БЯРОЗА КАСЦІНСКАЯ – Кобрынскі р-н, БЯРОЗАВІЧЫ – Пінскі р-н, БЯРОЗАВЫЯ КЛАДКІ – Пружанскі р-н, БЯРОЗАЎКА – Баранавіцкі, Брэсцкі, Камянецкі, Пружанскі р-ны, БЯРОЗКІ – Ляхавіцкі р-н, БЯРОЗНА – Кобрынскі р-н, ЗАБЯРЭЗЗЕ – Брэсцкі, Пінскі р-ны.

Да групы айконімаў, суадносных з канкрэтнымі найменнямі дрэў, намі таксама аднесены і наступныя:

АЛЬХОЎКА – Кобрынскі р-н

АЛЬХОЎЦЫ – Ляхавіцкі р-н

АРЭХАВА – Маларыцкі р-н

АСІНКІ – Камянецкі р-н

АСІНЫ – Брэсцкі р-н

БЕРАСТЫ /Пружанскі р-н/, БРЭСТ /Брэсцкі р-н/ – ад бераст – “дрэвавая або кустовая расліна сямейства вязавых”

ВІШНЁЎКА – Івацэвіцкі р-н

ВІШНЯ – Пружанскі р-н

ВЯЗ – Пінскі р-н

ВЯРБА – Камянецкі р-н

ГРАБАВЕЦ – Баранавіцкі р-н

ГРАБАЎЦЫ – Жабінкаўскі р-н

ГРУШАВА – Кобрынскі р-н

ГРУШАЎКА – Ляхавіцкі р-н

ГРУШКА – Маларыцкі р-н

ЁЛКІ – Івацэвіцкі р-н

КАШТАНАЎКА – Пружанскі р-н

ЛІПАВА – Кобрынскі р-н

ЛІПАВІЦА – Пінскі р-н

ЛІПІНКІ – Брэсцкі р-н

ЛІПНА – Камянецкі р-н

РАКІТНА /Лунінецкі р-н/, РАКІТНІЦА /Жабінкаўскі р-н/ – ад ракіта –“дрэва або куст сямейства вярбовых”

САСНОВАЯ – Баранавіцкі р-н

САСНОВІЧЫ – Пінскі р-н

САСНОВЫ – Івацэвіцкі, Столінскі р-ны

САСНОЎКА – Бярозаўскі, Лунінецкі, Пружанскі р-ны

СОСНЫ – Камянецкі р-н

СЯМІСОСНЫ – Брэсцкі р-н

ЯВАРОВА – Лунінецкі р-н

ЯСЕНЬ – Пружанскі р-н

ЯСІНАЎКА – Камянецкі р-н

ПАД’ЯСЕННЕ – Іванаўскі р-н

Лінгвагеаграфічны аналіз паказаў, што айконімы, суадносныя з лексемамі дуб і бяроза досыць шырока і раўнамерна прадстаўлены па ўсёй тэрыторыі Брэсцкай вобласці, тады як астатнія найменні не маюць строга абмежаваных арэалаў пашырэння.

Для ўтварэння айконімаў, матываваных найменнямі кустарнікаў, выкарыстоўваюцца літаратурныя і дыялектныя лексемы. Назвы гэтай групы спарадычна прадстаўлены на тэрыторыі Брэсцкай вобласці:

БЭЗАК /Маларыцкі р-н/ – ад лексемы бэз “дэкаратыўная кустовая расліна”, КРУШЫН – Столінскі р-н, КРУШЫНА – Брэсцкі р-н, ЛАЗІЦА – Маларыцкі р-н, ЛАЗОВА – Бярозаўскі р-н, ЛАЗОЎКА – Пружанскі р-н, ЛАЗЫ – Брэсцкі р-н, ЛОЗЫ – Баранавіцкі р-н, МАЛІНАЎКА – Маларыцкі р-н, ЧАРНІЧНА – Кобрынскі р-н, ЧАРНІЧНАЕ – Бярозаўскі, Кобрынскі р-ны.

Сярод назваў населеных пунктаў, суадносных з найменнямі травяністых раслін, вылучаецца некалькі падгруп:

айконімы, суадносныя з назвамі лугавых, палявых і водных травяністых раслін:

ДЗЯГЕЛЕЦ /Бярозаўскі р-н/, ДЗЯГЛІ /Жабінкаўскі р-н/ – ад дзягіль “травяністая меданосная расліна”

РАМАШКІ – Ляхавіцкі р-н

МАКАВА – Ганцавіцкі р-н

МАКАВІШЧЫ – Камянецкі р-н

РАГОЗНА /Жабінкаўскі, Брэсцкі р-ны/, РАГОЗНІЦА /Баранавіцкі р-н/ – ад рагоз “травяністая расліна”

ЧАМЯРЫ /Камянецкі р-н/, ЧАМЯРЫН /Пінскі р-н/, ЧАМЯРЫННЕ /Маларыцкі р-н/, ЧЭМЕР /Кобрынскі р-н/ – ад рэг. чэмер “трава чамярыца”

2) айконімы, суадносныя з назвамі сельскагаспадарчых травяністых раслін: БАБЫ – Лунінецкі р-н, БОБІНКА – Камянецкі р-н, БОБКІ – Драгічынскі р-н, БУРАКОЎЦЫ – Ляхавіцкі р-н, ГАРОХАВІШЧА – Маларыцкі р-н, ГРАЧЫХІ – Баранавіцкі р-н, КАНОПЛІСК – Пружанскі р-н, РЭПІШЧА – Камянецкі р-н, ХМЕЛЕВА – Жабінкаўскі р-н, ХМЕЛІШЧА – Маларыцкі р-н, ХМЯЛЁЎКА – Жабінкаўскі, Маларыцкі р-ны, ХМЯЛІ – Камянецкі р-н, ХМЯЛЬНІК – Лунінецкі р-н.

Аналіз утваральных асноў найменняў населеных пунктаў, суадносных з назвамі травяністых раслін, паказаў, што найбольш прадуктыўнымі з’яўляюцца лексемы хмель, чэмер, рагоз. Геаграфічны аналіз сведчыць, што айконімы адзначанай групы не зафіксаваныя ў Брэсцкім, Драгічынскім, Іванаўскім, Івацэвіцкім і Столінскім раёнах Брэсцкай вобласці.

Пры ўтварэнні айконімаў, суадносных з найменнямі лясных, садовых масіваў, зараснікаў, хмызнякоў, найбольш прадуктыўнымі з’яўляюцца лексемы бор (рэг. бур), лес, дуброва, беразняк. Лексіка-семантычны аналіз паказаў, што айконімы, матываваныя назоўнікамі бор, лес, даволі распаўсюджаны на тэрыторыі Брэсцкай вобласці і сустракаюцца практычна паўсямесна:

БОР – Баранавіцкі, Лунінецкі р-ны

БОР-ДУБЕНЕЦ – Столінскі р-н

БОР-ЛІПЫ – Пружанскі р-н

ГАЛЫ БОР – Лунінецкі р-н

ЗЯЛЁНЫ БОР – Івацэвіцкі, Лунінецкі р-ны

ЕЛІНСКІ БОР – Камянецкі р-н

КУКАВА-БОР – Ганцавіцкі р-н

ЛЮТЫ БОР – Столінскі р-н

НОВЫ БОР – Столінскі р-н

СУХІ БОР – Іванаўскі р-н

ВЯЛІКІ (МАЛЫ) ДОБРЫ БОР –Баранавіцкі р-н

БАРАВАЯ – Іванаўскі, Лунінецкі, Маларыцкі р-ны

БАРАЎЦЫ – Баранавіцкі, Лунінецкі р-ны

БАРКІ – Лунінецкі р-н

БАРОК – Лунінецкі р-н

БОРКІ – Маларыцкі, Бярозаўскі, Ганцавіцкі, Івацэвіцкі, Кобрынскі, Пінскі, Пружанскі р-ны

ГОЛЫ БАРОК – Камянецкі р-н

ЗАБАРАЎЦЫ – Пінскі р-н

ЗАБЕР’Е – Маларыцкі, Ляхавіцкі р-ны

ЗАБОР’Е – Іванаўскі р-н

ЗБУРАЖ – Маларыцкі р-н

НОВЫЯ БОРКІ – Маларыцкі р-н

ПАДБАРОЧЧА – Ляхавіцкі р-н

ПАДБЕР’Е – Кобрынскі р-н

ПАДБУР’Е – Камянецкі р-н

ПРЫБАРАВА – Брэсцкі, Івацэвіцкі р-ны

СУХІ БАРОК – Лунінецкі р-н

СЯРОДБОР’Е – Лунінецкі р-н

Айконімы, якія маюць у сваёй аснове лексему бор не зафіксаваны ў Жабінкаўскім і Драгічынскім раёнах.

БЕЛАЛЕССЕ – Баранавіцкі р-н

БЕЛЫ ЛЯСОК – Пружанскі р-н

ВЕРХАЛЕССЕ – Кобрынскі р-н

ВЯЛІКАЕ (МАЛОЕ) МІЖЛЕССЕ – Бярозаўскі р-н

ВЯЛІКАЕ (МАЛОЕ) ПАДЛЕССЕ – Ляхавіцкі р-н

ВЯЛІКІ ЛЕС – Драгічынскі, Камянецкі, Столінскі р-ны

ВЯРХЛЕССЕ – Баранавіцкі р-н

ЗАЛЕССЕ – Кобрынскі, Брэсцкі, Камянецкі, Пінскі, Баранавіцкі, Драгічынскі, Пружанскі р-ны

КРЫВЫ ЛЕС – Пінскі р-н

ЛЕСКІ – Камянецкі р-н

ЛЯСНАЯ – Баранавіцкі р-н

ЛЯСОК – Камянецкі р-н

ЛЯСНЫ – Столінскі р-н

ЛЯСНЫЯ – Лунінецкі р-н
МАЛАДЫ ЛЕС – Лунінецкі р-н
МІЖЛЕССЕ – Лунінецкі р-н
НАВАЛЕСКІ – Маларыцкі р-н
НАВАЛЕССЕ – Маларыцкі р-н
ПАЛЕСКІ – Лунінецкі р-н
ПАДЗАЛЕССЕ – Пінскі р-н
ПАДЛЕССЕ – Жабінкаўскі, Камянецкі, Драгічынскі р-ны
ПАДЛЕССЕ РАДВАНІЦКАЕ – Брэсцкі р-н
ПАДЛЕССЕ КАМЯНЕЦКАЕ – Брэсцкі р-н
ПЕРАЛЕССЕ – Кобрынскі р-н

Назвы населеных пунктаў, суадносныя з лексемай лес не адзначаны ў Іванаўскім і Івацэвіцкім раёнах.

Лексемамі альшанік (рэг. "алешнік, альховы лес"), асіннік, гай, беразняк (рэг."бярозавы лес"), дуброва/дубрава/дуброўка/дубраўка/

дубняк ("дубовы лес"), ельня (руск. рэг. "ельнік, яловы лес"), ліпнік (рэг. "ліпавы лес"), сад, сквер, хвойнік матываваны наступныя айконімы Брэсцкай вобласці:

АЛЬШАНКА – Пінскі р-н
АЛЬШАНЫ – Пружанскі, Столінскі р-ны
АСІННІКІ – Камянецкі р-н
БЕРАЗНЯКІ – Камянецкі р-н
БЯРЭЗНІЦА – Пружанскі р-н
ГАЙКОЎКА – Кобрынскі р-н
ГАЙКОЎЦЫ – Баранавіцкі р-н
ДУБНЯКІ – Ганцавіцкі р-н
ДУБРАЎКІ – Драгічынскі р-н
ДУБРАЎЦЫ – Камянецкі р-н
ДУБРОВА – Брэсцкі, Драгічынскі, Камянецкі, Маларыцкі р-ны
ДУБРОЎКА – Брэсцкі р-н
ДУБРОЎНА – Баранавіцкі р-н
МОКРАЯ ДУБРАВА – Пінскі р-н
ЕЛЬНЯ – Ганцавіцкі р-н
ЗАЯЛЕННЕ – Драгічынскі р-н
ЗАЛІПЕННЕ – Ляхавіцкі р-н
ЛІПНІКІ – Драгічынскі, Кобрынскі, Пінскі р-ны
САДЗІШЧА – Маларыцкі р-н
САДОВЫ – Пінскі р-н
СКВЕРЫКІ – Брэсцкі р-н
ХВОЙНІК – Пружанскі р-н

Трэба адзначыць, што не заўсёды ўдаецца адназначна выявіць ўтваральную базу айконімаў, таму сярод разгледжаных намі найменняў, суадносных з фларыстычнымі апелятывамі, некаторыя можна таксама матываваць гідронімамі ці антрапонімамі, якія суадносяцца з найменнямі раслiннага свету.

Айконімы Брэсцкай вобласці, суадносныя з фларыстычнымі назвамі, дарэчы, як і айконімы іншых лексіка-семантычных разрадаў, у структурных адносінах падзяляюцца на тры групы: простыя, складаныя, састаўныя. Пераважаюць простыя найменні (у форме назоўніка ці субстантываванага праметніка): Барок, Бяроза, Боркі, Вішня, Вяз, Дубічна, Дубава, Дубок, Ёлкі, Карані, Лозы, Рамашкі, Сосны, Травы, Чэмер, Ясень.

Айконімам уласціва форма адзіночнага і множнага ліку. Гэты крытэрый улічваецца пры класіфікацыі назваў паселішчаў таму, што флексія ў складзе тапанімічных фармантаў страціла апелятыўную функцыю граматычнага паказчыка адзінкавасці і множнасці і часцей за ўсё не выдзяляецца як асобны структурны элемент, а разглядаецца як элемент тапанімічнага фарманта ці як носьбіт чыста тапанімічнай функцыі. Да таго ж, адзіночналікавыя і множналікавыя айконімы могуць адрозніваца па прынцыпах утварэння.

У даследуемым рэгіёне адзначана 80 простых айконімаў (назвы 120 населеных пунктаў). 95% простых айконімаў маюць форму адзіночнага ці множнага ліку назоўніка і 5% – форму прыметніка.

Сярод айконімаў у форме singularia tantum (53 адзінкі, назвы 85 населеных пунктаў) вылучаюцца бязафіксныя і афіксальныя (суфіксальныя, прэфіксальныя, прэфіксальна-суфіксальныя) утварэнні.

Да айконімаў бязафікснага ўтварэння належаць найменні, якія не маюць у сваёй структуры спецыяльных тапанімічных афіксаў. Яны ўтвораны шляхам пераасэнсавання апелятываў ці онімаў. Бязафікснымі з'яўляюцца айконімы, па граматычнай структуры роўныя апелятывам як з невытворнай асновай (БЯРОЗА – Бяр., КРУШЫНА – Кобр., ВІШНЯ – Пруж., ВЯЗ – Пін., ВЯРБА – Кам., ЯСЕНЬ – Пруж.р.), так і з вытворнай асновай (апелятывы без спецыяльных айканімічных фармантаў): БАРОК – Лун., БЯРОЗАЎКА – Бар., ВІШНЁЎКА – Іван., ГРУШКА – Мал., ДУБРОЎКА – Бр., КАШТАНАЎКА – Пруж., МАЛІНАЎКА – Мал., ГАРОХАВІШЧА – Мал., ХВОЙНІК – Пруж., ЯГАДНАЯ – Бар., ЯСІНАЎКА – Кам.

Асобную групу бязафікснага ўтварэння складаюць найменні паселішчаў, што ўзніклі на базе прыметнікаў у выніку іх субстантывацыі. Адны з іх матываваны назвамі парод дрэў (АРЭХАВА – Мал., ГРУШАВА – Кобр., ДУБАВА – Бар., ДУБАВАЯ – Драг., ДУБАВОЕ – Кам., ЛІПАВА – Кобр., , САСНОВАЯ – Бар., ЯЛОВАЯ – Ганц.); другія назвамі лясных, садовых масіваў (БАРАВАЯ – Мал., ЛЯСНАЯ – Бар., ЛЯСНЫ – Стол., ЛЯСНЫЯ – Лун., САДОВЫ – Пін., ФРУКТОВЫ – Кобр.). Айконімы гэтага тыпу суадносяцца з якаснымі і адноснымі ад'ектывамі.

Цікава, што некаторыя адносныя прыметнікі, якія ўзніклі на базе апелятываў, афармляюцца па мадэлі адантрапанімічных. Да апелятыўнай асновы далучаюцца суфіксы -ава, -ова, якія звычайна спалучаюцца выключна з антрапонімамі, утвараючы прыналежныя прыметнікі: БАРАВАЯ, ГРУШАВА, ДУБАВА, ДУБРОВА, ЛІПАВА, МАКАВА, САСНОВАЯ, ЯЛОВАЯ.

У асобную групу вылучаюцца айконімы з суфіксам -на, якія з'яўляюцца сцягненай формай адносных прыметнікаў жаночага ці ніякага роду: БЯРОЗНА – Кобр., ДУБІЧНА – Мал., ДУБІНА – Кобр., ЛІПНА – Кам.

Значная роля пры ўтварэнні айконімаў, суадносных з назвамі расліннага свету, належыць суфіксацыі. Так утвораны 86 айконімаў. Найбольш распаўсюджанымі і прадуктыўнымі з'яўляюцца фарманты -аўка (-оўка), -ец (-эц), -іца (-ыца), -іна (-ына), -ава (-ова), -шчына, -аўшчына.

Пры ўтварэнні айконімаў даволі актыўна і паслядоўна выкарыстоўваецца мадэль Pluralia tantum. У ёй вылучаюцца флексійныя назвы, у якіх флексія множнага ліку з'яўляецца сродкам айканімізацыі апелятыва.У айконімах, утвораных на базе прыродна-геаграфічных тэрмінаў ці назваў, звязаных з дзейнасцю чалавека, форма множнага ліку звычайна з'яўляецца паказчыкам рэальнага мноства ці прасторавай працягласці: АСІНКІ – Кам., АСІНЫ – Бр., БАБЫ – Лун., БАЛОТЫ – Кобр., БОРКІ – Мал., БЯРОЗКІ – Лях., ДУБІНЫ – Кобр., ДУБНЯКІ – Ганц., ДУБЫ – Бяр., ЁЛКІ – Іван., КАЛІНЫ – Іван., ЛАЗЫ – Бр., ЛЕСКІ – Камян., РАМАШКІ – Лях., СОСНЫ –Кам., ТРАВЫ – Кобр., ХМЯЛІ – Кам. і інш. Да другой групы належаць айконімы, у якіх

суфікс і флексія множнага ліку ў выніку працяглага ўжывання ў айканіміі зрасліся і ўтварылі непадзельны айканімічны фармант. На Брэстчыне вылучаецца некалькі мадэлей такіх найменняў. З фармантамі -ачы, -авічы (-овічы), -аўцы (-оўцы), -ішчы зафіксаваны айконімы: АЛЬХОЎЦЫ – Лях., БАРАЎЦЫ – Бар., БУРАКОЎЦЫ – Лях., БЯРОЗАВІЧЫ – Пін., ГАЙКОЎЦЫ – Бар., ГРАБАЎЦЫ – Жаб., ДУБНАВІЧЫ – Пін., ЗАБАРАЎЦЫ – Пін., КУСТОВІЧЫ – Кобр., МАКАВІШЧЫ – Кам., САСНОВІЧЫ – Пін. У афармленні суфіксаў -аны (-яны), -іны прадстаўлены найменні: АЛЬШАНЫ – Пруж., БЕРАЗЛЯНЫ – Іван., ЗАМОШАНЫ – Жаб., ЗАМШАНЫ – Мал., КАЛІНЫ – Іван., ДУБІНЫ – Кобр.

У агульным балансе айканіміі Брэсцкай вобласці, суадноснай з фларыстычнымі назвамі, састаўныя айконімы ўтвараюць даволі значную групу. Усяго зафіксавана 27 найменняў.

Пераважная большасць найменняў складаецца з двух кампанентаў – азначаемага і азначальнага: БЕЛЫ ЛЯСОК – Пруж., БЯРОЗАВЫЯ КЛАДКІ – Пруж., ВЯЛІКАЕ ПАДЛЕССЕ – Лях., ВЯЛІКАЕ МІЖЛЕССЕ – Бяр. і інш. Зафіксаваны назвы і трохкампанентныя: ВЯЛІКІ ДОБРЫ БОР, МАЛЫ ДОБРЫ БОР – Бар.

Пераважаюць словазлучэнні, у якіх атрыбутыў стаіць у прэпазіцыі да субстантыўнага кампанента і паясняе яго: ГОЛЫ БАРОК – Кам., ВЯЛІКІ ЛЕС – Кам., ЗЯЛЁНЫ БОР – Іван. і інш. Пры гэтым адзначаны назвы населеных пунктаў, у якіх атрыбутыў знаходзіцца ў постпазіцыі: БЯРОЗА КАРТУЗСКАЯ – Бар., БЯРОЗА КАСЦІНСКАЯ – Кобр., ПАДЛЕССЕ РАДВАНІЦКАЕ – Бр., ПАДЛЕССЕ КАМЯНЕЦКАЕ – Бр.

Састаўныя айконімы Брэсцкай вобласці, суадносныя з фларыстычнымі назвамі, ужываюцца як у форме адзіночнага (КАСЦІНСКАЯ БЯРОЗА – Кобр., ЯЛОВЫ ГРУД – Кам., ЕЛІНСКІ БОР – Кам.), так і множнага ліку (БЯРОЗАВЫЯ КЛАДКІ – Пруж., НОВЫЯ БОРКІ – Мал.).

На аснове граматычнай характарыстыкі кампанентаў можна вылучыць наступныя мадэлі састаўных айконімаў: “якасны прыметнік + назоўнік”, “адносны прыметнік + назоўнік”, “назоўнік + адносна-прыналежны прыметнік”.

1. “Якасны прыметнік + назоўнік”. Самая значная група састаўных найменняў. Атрыбутыўны кампанент звычайна ўказвае на знешнюю прыкмету аб’екта, назва якога паслужыла асновай для субстантыўнага кампанента: БЕЛЫ ЛЯСОК – Пруж., ВЯЛІКІ ЛЕС – Кам., ГОЛЫ БАРОК – Кам., ДОБРЫ БОР – Бар., ЗЯЛЁНЫ БОР – Івац., КРЫВЫ ЛЕС – Пін., ЛЮТЫ БОР – Стол., МАЛАДЫ ЛЕС – Лун., НОВЫ БОР – Стол., СУХІ БОР – Іван., ТОЎСТЫ ДУБ – Лун.

У састаўных назвах, што ўзніклі на ўзроўні айканіміі, азначэнне можа ўказваць на адносную храналогію ўзнікнення населеных пунктаў, утвараючы антанімічныя пары. У якасці атрыбутыва ў такіх айконімах выкарыстоўваюцца якасныя прыметнікі вялікі – малы, стары – новы: МАЛОЕ МІЖЛЕССЕ – ВЯЛІКАЕ МІЖЛЕССЕ, МАЛОЕ ПАДЛЕССЕ – ВЯЛІКАЕ ПАДЛЕССЕ, МАЛЫ БОР – ВЯЛІКІ БОР, МАЛАДЫ ЛЕС – СТАРЫ ЛЕС, МАЛЫ ДОБРЫ БОР – ВЯЛІКІ ДОБРЫ БОР.

2. “Адносны прыметнік + назоўнік”. Па Брэсцкай вобласці гэтая мадэль непрадуктыўная: ЕЛІНСКІ БОР – Кам., МОКРАЯ ДУБРАВА – Пін., ЯЛОВЫ ГРУД – Кам.

3. “Назоўнік + адносна-прыналежны прыметнік”. Атрыбутыў у айконімах, утвораных па гэтай мадэлі, указвае на адносную прыналежнасць новай назвы да старой і матываваны ўласнымі назвамі населеных пунктаў: БЯРОЗА КАРТУЗСКАЯ – Бяр., БЯРОЗА КАСЦІНСКАЯ – Кобр., ПАДЛЕССЕ РАДВАНІЦКАЕ – Бр., ПАДЛЕССЕ КАМЯНЕЦКАЕ – Бр.

Складанне ў даследуемым рэгіёне адносіцца да непрадуктыўных тыпаў утварэння назваў населеных пунктаў. Таму айконімы-кампазіты сустракаюцца толькі спарадычна: БЕЛАЛЕССЕ – Бар., БОР-ДУБЕНЕЦ – Стол., БОР-ЛІПЫ – Пруж., ВЕРХАЛЕССЕ – Кобр., ВЯРХЛЕССЕ – Бар., КУКАВА-БОР – Ганц., НАВАЛЕСКІ – Мал., НАВАЛЕССЕ – Мал., СТАРАДУБЦЫ – Кобр., СЯМІСОСНЫ – Бр.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Лемцюгова, В. П. Беларуская айканімія. Лінгвістычны аналіз назваў населеных пунктаў Мінскай вобласці. – Мінск, 1970.

***Jakubuk N.R.*** **Oiconyms of Brest region, which are motivated by florist terms**

The article considers structural-semantic analysis of Brest region's oiconyms, which are motivated by florist terms.